■ Парламенцкі дзённік

# ЯК ДАПАМАГЧЫ РАЗВІЦЦЮ КРАІНЫ?

## За кошт заканадаўчай базы

**У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу адбылося пашыранае пасяджэнне Прэзідыума верхняй палаты беларускага парламента з удзелам прэзідыумаў абласных Саветаў дэпутатаў, а таксама вышэйшых службовых асоб, кіраўнікоў. На парадку дня адно пытанне — як члены Савета Рэспублікі змогуць паспрыяць рэалізацыі прыярытэтаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016-2020 гады.**

Значную ролю ў паляпшэнні эканамічнага стану краіны могуць адыграць менавіта члены Савета Рэспублікі, лічыць яго старшыня Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. «Пры гэтым мы не павінны выконваць функцыю выканаўчай улады і выканаўчай вертыкалі ў цэлым. Нам трэба будзе з улікам дзеючага заканадаўства сфармуляваць задачы для Савета Рэспублікі, мясцовых Саветаў дэпутатаў і прыступіць да іх выканання. У першую чаргу — за кошт пашырэння нарматыўна-прававой базы», — адзначыў спікер верхняй палаты.

### Інвестыцыі падмацуюць эканоміку

Адным з прыярытэтаў краіны на бліжэйшыя гады з'яўляецца інвестыцыйная дзейнасць, і ў той жа час яна — адна з крыніц росту ВУП. У Савеце Рэспублікі ўжо было прааналізаванае заканадаўства ў гэтай сферы. Міхаіл Мясніковіч прапаноўвае аддаць прыярытэт прамым замежным інвестыцыям, а сенатараў заклікае зрабіць усё магчымае для стварэння спрыяльнага інвестыцыйнага клімату. На думку спікера, гэтаму будзе садзейнічаць і прыняцце адзінага закона аб інвестыцыйнай дзейнасці, «які ўтрымлівае норму прамога дзеяння».

«Сёння дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы інвестыцый ажыццяўляецца больш чым 40 дзяржаўнымі органамі. 34 прававыя нарматыўныя акты рэгулююць пытанні ажыццяўлення інвестыцый, 21 з якіх — гэта заканадаўчы акт, — кажа старшыня Савета Рэспублікі. — Разнастайнасць крыніц нарматыўнага рэгулявання спараджае вельмі адну праблему — адсутнасць прававой стабільнасці ва ўмовах гаспадарання. Для інвестараў гэта вельмі важна. Акрамя таго, сур'ёзную боязь у інвестараў выклікае сфера прымянення адказнасці. Узнікае пытанне аб несуразмернасці штрафных санкцый па інвестыцыйных дагаворах і выяўленых парушэннях».

На думку Міхаіла Мясніковіча, варта больш актыўна практыкаваць вынясенне папярэджанняў аб недапушчальнасці парушэння як першага кроку кантролю замест штрафу ці больш цяжкага пакарання. Таксама, на яго думку, развіццю сферы перашкаджае дзеянне пераважнага права аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама на куплю некаторай катэгорыі акцый і магчымасць выкарыстання мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі фармальных падстаў для скасавання інвестыцыйных дагавораў нават з-за нязначных парушэнняў тэрмінаў іх рэалізацыі. Увядзенне мараторыя на правядзенне праверак у адносінах да наваствораных прадпрыемстваў, якія інвестуюць у асноўныя фонды, хоць і замацавана заканадаўча, але аказвае слабое стымулюючае ўздзеянне на развіццё інвестыцыйнай дзейнасці прадпрыемстваў не толькі малога бізнесу, але і буйных greenfield-праектаў. «Для вырашэння гэтых пытанняў спатрэбіцца ўнясенне змяненняў у законы аб інвестыцыях, аб канцэсіях, аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, прынясце новага закона аб інвестыцыйных фондах, а таксама карэкціроўка асобных палажэнняў Грамадзянскага і Падатковага кодэксаў Беларусі», — дадаў ён.

### Занятасць можа быць рознай

Што тычыцца занятасці насельніцтва, то тут старшыня верхняй палаты прапанаваў легалізаваць індывідуальную працоўную дзейнасць без адкрыцця ІП. «Трэба ўводзіць патэнт для самазанятасці і вызначыць прававы статус самазанятага, — лічыць Міхаіл Мясніковіч. — Рэгістрацыя праз куплю патэнта на самазанятасць без пастаноўкі на ўлік у якасці беспрацоўных прастымулюе прадпрымальніцкую актыўнасць асоб, якія страцілі работу, выхад з ценю тых, хто доўгі час не працуе, але ўцягнуты ў ценявую занятасць людзей».

Тэрмін «самазанятасць» і азначэнне «самазанятасці» ў нацыянальным заканадаўстве зараз адсутнічаюць. На думку спікера, да самазанятасці могуць быць аднесены асобы, якія працуюць па заяўным прынцыпе без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка: рамеснікі, супрацоўнікі сферы аграэкатурызму, рабочыя асабістых падсобных гаспадарак, асобы, якія займаюцца прыбіраннем, бытавымі паслугамі. «Можна было б пашырыць віды дзейнасці, дапоўніўшы пералік будаўніча-мантажнымі, рамонтнымі работамі, перавозкай пасажыраў і грузаў. Сёння многія з гэтых работ у цэні, людзі пры гэтым не абаронены, не могуць адстойваць свае пазіцыі ў судзе», — кажа спікер верхняй палаты і дадае, што самазанятасць можа сумяшчацца і з асноўнай працай па працоўным дагаворы.

Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што сенатары і мясцовыя Саветы дэпутатаў павінны імкнуцца да развіцця і падтрымкі такіх сфер, як страхавы рынак, экспарт (уніфікацыя і гарманізацыя заканадаўства з краінамі ЕАЭС), укараненне інфармацыйных тэхналогій, маладзёжная палітыка...

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Выбары-2016

# ДЫЯЛОГ, ЯКІ НАТХНЯЕ

## Хто такі дэпутат і што ён робіць? Як ствараюцца законы? Ці магу я асабіста паўплываць на будучыню сваёй краіны?

**Такія дарослыя пытанні задавалі на працягу гадзіны дзеці, якія адпачывалі ў дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Пралеска» Жлобінскага раёна.**



Адказвалі ім дарослыя, сярод якіх былі і дэпутаты, і прадстаўнікі органаў улады, і кіраўнікі грамадскіх арганізацый БРСМ і БРПА. У межах рэспубліканскага праекта «Адкрыты дыялог» была арганізавана дыскусійная пляцоўка для моладзі па абмене думкамі па актуальных пытаннях, якія абмяркоўваюць у грамадстве. Дзеці спачатку сарамеліся, але калі старшыня Цэнтральнага савета піянерскай арганізацыі Вікторыя Мянанава пачала сама задаваць пытанні на тэмы, якія іх хвалююць, разняволіліся і пачалі выказваць свае меркаванні.

Між тым, як расказаў старшыня Гомельскай абласной піянерскай арганізацыі Арцём Карпенка, звычайная змена ў аздараўленчым цэнтры ператварылася ў тэматычную — пад назвай «Разумныя канікулы: салют піянерыі!»

— Штодзень каля 300 школьнікаў не толькі атрымлівалі пэўныя лячэбныя працэдуры, але і вольнай часінай актыўна ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах. Для іх былі арганізаваны тэматычныя дні. Супрацоўнікі МНС, ДАІ і выратавальнікі на вадзе праводзілі спецыялізаваныя заняткі ў межах акцыі «Шчаслівае лета». Тут праведзены Дзень культуры, акцыя «Кніга.by», тэматычныя дні патрыёта і фінансавай пісьменнасці.

Яшчэ ў аздараўленчым цэнтры на працягу змены актыўна працаваў карпункт юных журналістаў. Пісаць і афармляць артыкулы дзецям дапамагалі журналісты жлобінскай газеты «Новы дзень». Урэшце атрымалася ствараць папяровыя насценгазеты, дзе расказвалася пра змястоўнае жыццё ў аздараўленчым цэнтры. Акрамя таго, на старонцы сацыяльнай сеткі «УКантакце» штодзень з'яўляліся аператыўныя рэпартажы пра адметныя мерапрыемствы школьнікаў.

Старшыня Цэнтральнага савета піянерскай арганізацыі Вікторыя Мянанава адзначыла, што дыскусійная пляцоўка дапамагае моладзі ставіць праблемы і вырашаць іх, прапаноўваць ідэі, якія б хацелася рэалізаваць.

— Мне прыемная тая аддача, якую атрымліваю. Дыялог натхняе на новыя планы. Хочацца, каб дзеці былі нераўнадушнымі да свайго жыцця, да лёсу сваіх бацькоў, настаўнікаў і ўрэшце сваёй краіны. Калі чалавек разумее сваю ролю ў жыцці і гатовы нешта зрабіць для сваёй дзяржавы, ён будзе сапраўдным яе грамадзянінам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

❍ Тым часам

## Забяспечыць парадак на выбарах гатовы

**Да асноўнага дня парламенцкіх выбараў засталося два з паловай тыдні. Датэрмінове галасаванне пачнецца ўжо 5 верасня. І ад гэтага дня падраздзяленні Міністэрства ўнутраных спраў пачнуць працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. Працягнецца гэта цэлы тыдзень.**

— Ва ўсіх структурных падраздзяленнях Міністэрства ўнутраных спраў наладжана ўзаемадзеянне з выбарчымі камісіямі, выканаўчымі і распарадчымі органамі, — паведаміў начальнік упраўлення аховы правапарадку галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Дзмітрый КУР'ЯН. — Зараз нашы супрацоўнікі правяраюць тэхнічную ўмацаванасць выбарчых участкаў. А з 5 па 12 верасня будзе наладжана кругласутачная праца аператыўна-секцыйных штабоў. Выбарчая кампанія цяпер праходзіць у спакойнай абстаноўцы. Фактараў, якія могуць аказаць негатыўны ўплыў на ход яе правядзення, мы не бачым. Наша работа дазваляе забяспечыць грамадскі парадак і бяспеку, а таксама адэкватнае рэагаванне на любыя змяненні аператыўнай абстаноўкі.

Акрамя таго, актыўны маніторынг участкаў для галасавання праводзяць супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Акцэнт робіцца на прафілактычнай рабоце.

— Са старшынямі выбарчых камісій і работнікамі аб'ектаў, дзе размешчаны ўчасткі для галасавання, мы праводзім адмысловыя заняткі, — расказаў першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра ўпраўлення і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Рэспублікі Беларусь Аляксандр Канавальчык. — Таксама адпрацоўваюцца схемы эвакуацыі грамадзян і тушэння пажараў. У асноўны дзень выбараў — 11 верасня — МНС таксама будзе працаваць ва ўзмоцненым рэжыме. На кожным участку будуць дзяжурыць нашы супрацоўнікі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Жніво-2016

# НЕДАБОРУ НЕ БУДЗЕ

## Стаўка на кукурузу

**Па словах намесніка міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміра Гракуна, у краіне сёлета плануецца сабраць каля 8,8 млн тон збожжа ва ўсіх катэгорыях гаспадарак з улікам кукурузы. Цяпер ужо намалочана больш за 6,7 млн тон збожжавых і зернебабовых культур. Засталося ўбраць яшчэ 131 тысячу га, з якіх 92 тысячы прыпадае на Віцебскую вобласць. Уборка зацягваецца з-за неспрыяльных умоў надвор'я.**

Цяпер на складах краіны захоўваецца больш за 1 млн тон збожжа з мінулага года. Гэта павінна перакрыць той недахоп, які склаўся сёлета — прыкладна крыху больш за 0,5 млн тон. Таксама плануецца намалаціць у 5,5 раза больш кукурузы на зерне. Яе ўбяруць з плошчы ў 180 тысяч га і намалоцяць 1,2-1,25 млн тон. Гэта таксама пакрые недабор ад збожжавых. У паўднёвых раёнах краіны ўборка кукурузы на насенне ўжо пачалася. Уладзімір Гракун паведаміў, што зараз здадзена каля 90% збожжа па дзяржзаказе.

Гаворачы аб сярэдняй ураджайнасці па краіне, намеснік міністра адзначыў, што сёлета яна складае 33,7 ц/га, што менш за леташні паказчык. Але пры гэтым шэсць раёнаў краіны, сярод якіх Гродзенскі, Берасцейскі, Шклоўскі, змаглі атрымаць ураджайнасць больш за 50 ц/га. Яшчэ ў дзесяці ўраджайнасць склала больш за 40 ц/га, а ў 52 раёнах яна перавысіла 30 ц/га.

Таксама, паводле яго слоў, сёлета плануецца сабраць больш за 500 тон кавуноў. Закранаючы тэму гародніны, намеснік міністра адзначыў, што ў апошнія гады ве вырошчваннем актыўна займаюцца не толькі сельгасарганізацыі, але і фермерскія гаспадаркі. У Беларусі цяпер 16,5 тысячы га пад агароднінными культурамі, з іх толькі 8 тысяч га — у сельгасарганізацый. Пры гэтым ужо ёсць насенне айчыннай селекцыі, якое фермеры бяруць усё больш ахвотна. Актыўна ідзе і закладка садоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Партнёры

## Не зважаючы на адлегласць

### Акадэмія кіравання зацікаўлена ў супрацоўніцтве з калегамі з Паднябеснай

**Дэлегацыя Кітайскай акадэміі кіруючых кадраў у сферы бізнесу з горада Далянь наведала сваіх беларускіх калег.**

Па словах **Аляксандра ІВАНОЎСКАГА, першага прарэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**, перспектыўнымі кірункамі для развіцця супрацоўніцтва з'яўляюцца ўзаемныя стажыроўкі супрацоўнікаў і кіраўніцтва, удзел у міжнародных навуковых і адукацыйных праграмах і праектах, публікацыі ў навуковых выданнях, правядзенне сумесных семінараў — праз інтэрнэт.

— Хачу сказаць, што наша ўзаемадзеянне з кітайскім бокам дастаткова шчыльнае. Мы дамовіліся да таго ж абмяняцца навуковымі часопісамі, публікацыямі, — расказаў Аляксандр Іваноўскі.

**Тан ЮЭ, віцэ-прэзідэнт Кітайскай акадэміі кіруючых кадраў у сферы бізнесу** адзначыў, што ўдзел нашай краіны ў праекце новага Шаўковага шляху «Адзін пояс — адзін шлях» дае магчымасць рэалізаваць сумесныя з Кітаем праекты і ў сферы адукацыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ ПА ТЭЛЕФОНЕ

**Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 27 жніўня чарговыя прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 на сувязь з жыхарамі краіны выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).